№ 16 (4063)

26 лютага 2016 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

www.nv-online.info

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выходзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

СЛЫШАЛИ?

Бизнесмен Александр Шакутин приютил Владимира Волкова

Как уже сообщалось, бывший заместитель председателя концерна «Белнефтехим» **Владимир Волков**, осужденный на восемь лет с конфискацией имущества, недавно был помилован и освобожден досрочно. Сразу после этого появилась информация, что бывший нефтяник возглавил дирекцию строящихся объектов Новополоцкого нефтеперерабатывающего завода.

Как удалось выяснить «Народной Воле», это предприятие было основано несколько лет назад, после того как ООО «Интерсервис» приобрел Новополоцкий завод белково-витаминных концентратов (БВК). Владельцами частного нефтетрейдера являются известные бизнесмены **Александр Шакутин и Николай Воробей.**

«Господин Волков уже приступил к своим должностным обязанностям», – об этом корреспонденту «Народной Воли» сообщили в офисе ООО «Интерсервис» в Новополоцке.

К сожалению, поговорить с Владимиром Волковым корреспонденту «Народной Воли» не удалось. На входе в офис «Интерсервиса» находится пост охраны. И хоть стой там с утра до вечера – охранники пропускают посетителей исключительно с разрешения руководства частной фирмы.

– *Владимир Волков действительно имеет отношение к нашему предприятию*, – рассказали «Народной Воле» в приемной «Интерсервиса». – *Он уже приступил к выполнению своих должностных обязанностей. Однако никакой другой информации я вам предоставить не могу – это внутренние кадровые вопросы. Оставьте свои координаты, если господин Волков решит с вами поговорить, он с вами свяжется.*

Роман ВАСЮКОВИЧ.

ИЗ АРХИВА

В одном из публичных выступлений А.Лукашенко рассказал, что бывшего зампреда концерна «Белнефтехим» задержали после получения им очередной части взятки. *«Арестованы две квартиры в Минске, гараж, дорогие автомобили, 100 тысяч долларов США,* – цитировали главу государства СМИ. – *Суд разберется, конечно же, откуда это имущество у обычного простого чиновника».*

По версии следствия, Волков от одного взяткодателя получил взяток на сумму 19 тысяч долларов. В его кабинете на протяжении семи месяцев велось круглосуточное наблюдение.

«Премьер, первый вице-премьер говорили: «Волков – святой человек», – комментировал А.Лукашенко «дело Волкова». – *Восемь или одиннадцать взяток зафиксировано только технически! Как говорится, пленку на стол – и смотри».*

На суде Владимир Волков заявил, что ему предлагали дать показания на своих коллег.

«…Две ночи я провел в РОВД, затем меня привезли на беседу в ГУБОПиК, – рассказывал он во время суда. – *Я плохо понимал, что происходит… Там мне предложили дать показания на руководство концерна, руководство Министерства экономики и Совета министров и рассказать о коррупционных связях высших должностных лиц с крупным бизнесом. Мне сказали, что меня досконально изучили, у меня нет больших покровителей… Нет, мне не угрожали, не подвешивали за ноги, пистолет ко лбу не приставляли. Мне предложили рассказать о коррупционных связях в Министерстве экономики, Совете министров и за это мне… Мне говорили: зачем тебе сидеть? Если ты так поступишь, то мы тебе и заменим меру пресечения. А если ты и их прихватишь, то они сами и тебя вытащат…»*

Никого оговаривать Волков не стал, но и своей вины не признал. Однако от тюрьмы сроком в восемь лет с конфискацией имущества это его не спасло. Впрочем, судьба повернулась другой стороной.

БЛИЦ

На недавнем совещании по повышению эффективности социально-экономического комплекса А.Г.Лукашенко заявил:

«У нас что, нет возможности себестоимость сократить на 25 процентов? Вы же посмотрите: мы в десять раз отстаем от Западной Европы, имея лучшие цены на сырье и энергоносители!»

Что и говорить, налицо колоссальный резерв. И редакция «Народной Воли», осознавая важность проблемы, обратилась к ряду руководителей и специалистов предприятий с вопросом:

Когда, в какие сроки вы снизите себестоимость продукции на 25 процентов?

Андрей СОКОЛОВСКИЙ, заместитель генерального директора по коммерческим вопросам ОАО «Глубокский молочноконсервный комбинат»:

– Пока трудно ответить на этот вопрос. Сейчас все подразделения комбината – бухгалтерия, планово-экономический отдел, производство, отделы снабжения и сбыта – работают именно над этим вопросом. После совещания у главы государства прошла неделя. Чтобы снизить на 25 процентов себестоимость, нужно пересмотреть контракты по закупке металлов, по вспомогательным материалам, посмотреть численность штата, чтобы не пострадали люди. Работа в этом направлении ведется, но так быстро я пока не могу ответить на этот вопрос…

Иван СВЯТОХО, председатель Белорусского независимого профсоюза ОАО «Нафтан»:

– Нужна реконструкция «Нафтана». Если это сделать и снизить закупочные цены на сырье, то можно будет говорить о снижении себестоимости на 25 процентов. Да, нам нужно оснастить завод новым оборудованием. Работа в этом направлении ведется, но этот процесс требует не только средств, но и времени. Реконструкция предприятия займет не один год.

Нина ПРИМШИЦ, заместитель генерального директора Минского тракторного завода по финансовым и экономическим вопросам:

– Волю президента надо выполнять. Если взяться всем за работу, можно, конечно, снизить себестоимость. Это абсолютно реально. Разумеется, не в один миг, а в течение определенного времени.

Ярослав ВОЛОЧНИК, заместитель директора по коммерческим вопросам Несвижского завода медицинских препаратов:

– Что я могу сказать? Нам дали команду – будем выполнять. В какие сроки ее реализуем – сказать не готов. Но будем стараться.

Николай ШАРАХ, заместитель председателя Свободного профсоюза ОАО «Стекловолокно»:

– Себестоимость снизится, когда будет повышена эффективность работы на «Стекловолокне». Для этого в первую очередь нужно обновить оборудование, потому что то, которое установлено более 30 лет назад, дает слабую отдачу. Необходима модернизация производства целиком.

Также следует решить вопрос организации труда – исключить ситуации, когда человек работает не по профессии. Есть ведь современные методы обучения персонала, которые нужно использовать.

Важный момент, что завод самостоятельно не сможет выполнить эту работу – не хватит средств. Государство также отказалось поддерживать большинство предприятий. Поэтому необходимо привлекать инвесторов. Другой вопрос – пойдут ли они к нам?

Тамара ТРУСЕВИЧ, заместитель генерального директора Минского завода строительных материалов:

– Мы разрабатываем план мероприятий. Ищем внутренние резервы. Ведь теперь надо экономить всюду: как дома, так и на предприятии. О конкретных сроках выполнения сказать не могу. Но работа у нас идет постоянно, этот вопрос всегда находится на контроле.

Ольга БРОВКО, заместитель генерального директора по экономике и финансам ОАО «Молодечненский молочный комбинат»:

– В этом году начинаем работать над этим вопросом, хотя сейчас у нас себестоимость ниже показателей прошлого года. Но снизить в 2016 году себестоимость продукции на 25 процентов – проблематично. Хотя бы вышли на цифры 5–10 процентов. Пока наше предприятие нерентабельно…

Дмитрий БУРДЮГОВ, начальник управления экономики ОАО «Минск Кристалл»:

– Снижение себестоимости продукции на 25 процентов – это весьма существенный рубеж. В этом году такой цифры точно не достигнем, может быть, через пару лет… Нынче, если снизим себестоимость на 10 процентов, уже будет хорошо.

Кстати, этот показатель зависит от многих факторов. У нас же энергоносители привязаны к валюте, сырье на импортозамещающую продукцию закупается за рубежом… Так что посмотрим, как дальше будет складываться ситуация.

Александр МИХНОВИЧ, заместитель директора по производству ОАО «Зенит-БелОМО» (Вилейка):

– На наше головное предприятие мы уже дали свои предложения по снижению себестоимости продукции. Речь идет о том, чтобы в 2016 году сократить затраты на 10–12 процентов.

***

Читатели наверняка обратили внимание на ответы интервьюируемых – в основном они общего порядка. Есть опасность, что основная причина проблемы кроется не в том, что нам кто-то мешает работать более эффективно, а в том, что на многих предприятиях низок кадровый потенциал. Современным производствам требуются, как говорится, современные мозги, глубокие знания в каждом конкретном деле. Минули времена, когда человек с четырьмя классами образования мог сказать: «Я швец, и жнец, и на дуде игрец»…

Опрашивали Роман ВАСЮКОВИЧ, Денис МАРТИНОВИЧ, Алесь СИВЫЙ.

УЧОРА



Як Пуцін прынізіў беларусаў…

У каго не здараюцца агаворкі! Вось і Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся ўчора да Уладзіміра Пуціна, выпадкова назваў яго Дзмітрыем Анатольевічам. І пачуў:

– Правильно, деньги все там.

Што ні кажыце, а гэта не жарт. Такім чынам “крамлёўскі цар” у чарговы раз прынізіў нас, беларусаў: маўляў, стаіце перад Расіяй з працягнутай рукой.

Вось і сябруй з такімі!

ВІНШУЕМ!

Міхаіл Пастухоў – рыцар года

Былы член Канстытуцыйнага суда Беларусі Міхаіл Пастухоў стаў лаўрэатам прэміі «З адкрытым забралам», заснаванай у памяць аб гвалтоўна зніклым экс-кіраўніку МУС генерале Юрыю Захаранку.

Міхаіла Іванавіча ўзнагародзілі за *«смеласць, волю і самаадданасць у барацьбе за адраджэнне свабоды і дэмакратыі ў Беларусі».*

У розныя гады лаўрэатамі прэміі імя Захаранкі былі генерал **Валерый Фралоў,** праваабаронца **Гары Паганяйла**, экс-кандыдаты ў прэзідэнты **Аляксандр Казулін і Мікалай Статкевіч**, прадпрымальнік **Мікалай Аўтуховіч,** журналіст **Аляксандр Тамковіч**.

НУ І НУ!

Дагуляўся…

Больш за мільён рублёў можа заплаціць жыхар Маладзечна за спробы паўдзельнічаць у тэлевіктарыне.

Арганізатары віктарыны, якая транслюецца па некалькіх тэлеканалах, прапануюць разгадаць няцяжкую загадку і абяцаюць узнагароду за правільны адказ, які трэба паведаміць, патэлефанаваўшы па паказаным на экране нумары. Мужчына больш за 40 разоў спрабаваў датэлефанавацца, але званок абрываўся.

За міжнародныя злучэнні «Белтэлекам» выставіў маладзечанцу рахунак на 1 мільён 100 тысяч рублёў, ад якога ён быў шакіраваны.

Пра гэты выпадак парталу kraj.by распавяла начальнік юрыдычнага аддзела гарадской арганізацыі Таварыства абароны спажыўцоў **Кацярына Балашова**.

Юрысты таварыства абароны спажыўцоў высветлілі, што ўдзельнічаць у тэлевіктарыне могуць толькі грамадзяне Расійскай Федэрацыі. Аднак падчас трансляцыі перадачы пра гэта ніхто не папярэджвае.

– *На экране паказваецца кароткі нумар для мабільнай сеткі, доўгі нумар для стацыянарнай сеткі, а таксама доўгі нумар для іншых краін свету*, – распавяла Балашова. – *Вось і атрымліваецца, што злучэнне ўсталёўвалася, але сувязь кожны раз абрывалася без тлумачэння прычыны.*

Пакуль кропка ў гэтай справе не пастаўлена. Аднак і юрысты, і пацярпелы маюць намер давесці справу да суда.

Вера ВІР.

МАЙЦЕ НА ЎВАЗЕ!

Дзесяць з паловай мільёнаў за шчупака

З 1 сакавіка па 15 красавіка ў Беларусі забаронена лавіць шчупакоў. За парушэнне забароны – штраф 10 з паловай мільёнаў. Абмежаванні і забароны на лоўлю шчупака звычайнага ўстаноўлены Правіламі вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства з мэтай стварэння спрыяльных умоў для яго размнажэння.

ГРОМКОЕ ДЕЛО

«Я с первого дня не понимаю, в чем меня обвиняют»

Только один подчиненный Анны Шарейко признал себя виновным. Бывший член Совета Республики, экс-директор Витебской бройлерной птицефабрики не признала себя виновной.

В Верховном суде продолжается суд по делу Анны Шарейко. Напомним, бывшего члена Совета Республики и экс-директора Витебской бройлерной птицефабрики обвиняют в злоупотреблении служебным положением. Якобы она определила победителя конкурса по закупкам кормов и кормовых добавок (компанию «Руском-Р»), отвергнув более дешевое предложение отечественного производителя (компании «Экомол»). Тем самым предприятию якобы был нанесен ущерб в особо крупном размере (более 4 миллиардов рублей).

В общей сложности старший прокурор Генпрокуратуры **Анатолий Метельский** читал обвинение более одного дня. По мнению обвинения, «Руском-Р» сознательно снижал цену на закупку кормов, чтобы их предложение оказалось более выгодным, чем у конкурентов. При этом руководители Витебской бройлерной фабрики якобы знали, что поставки по предложенной цене осуществляться не будут. Ведь в договоре было положение, согласно которому цена могла меняться из-за изменения стоимости сырья на мировом рынке. Обвинение в лице Метельского посчитало такой контракт *«заведомо невыгодным для Витебской птицефабрики»*. Гособвинитель привел такую цифру: согласно контракту, цена одной тонны кормов и кормовых добавок составляла 1160 евро. А затем увеличилась до 1186,92 евро. «Руском-Р» и в дальнейшем изменял условия доставки или просто менял цену. Таким образом фабрике наносился ущерб.

Шестеро из семи обвиняемых (в том числе и Анна Шарейко) свою вину не признали. Причем сделали это достаточно эмоционально. *«Я с первого дня не понимаю, в чем меня обвиняют»*, – заявил гражданин Литвы **Вольдемар Норкус**, который представляет фирму «Даймас» (ей принадлежит 100% акций ООО «Руском-Р»). *«В целом это кошмар. Для меня как для специалиста это абсурд!»* – высказала свою оценку **Надежда Семченкова**, заместитель директора фабрики. Свою вину признал лишь **Владимир Лиоренцевич**, главный специалист по внешнеэкономическим связям фабрики. Но при этом он отказался выступать в суде и попросил зачитать показания, которые давал в ходе следствия. Тогда Лиоренцевич заявил, что отвечал за расчет таможенных тарифов. О выборе победителя на конкурсе по закупке кормов и кормовых добавок он якобы имел смутное представление.

Первоначально государственный обвинитель предлагал установить следующий порядок следствия: выслушать Лиоренцевича, затем Шарейко, потом других обвиняемых. Но экс-директор Витебской бройлерной птицефабрики предложила свой вариант. По ее мнению, сначала надо было выслушать свидетелей, потом ознакомиться с материалами дела, и только потом перейти к допросу обвиняемых. Этот вариант был принят практически без изменения (судья вначале решил допросить Лиоренцевича). Поэтому показания Анны Шарейко можно будет услышать не скоро.

Денис МАРТИНОВИЧ.

ПА-ЗА ГУЛЬНЁЙ

Футбол – без міліцыі?

З гэтага футбольнага сезона МУС гатова прыбраць сваіх супрацоўнікаў са стадыёнаў, а на арэнах плануюць прадаваць піва.

Днямі адбылася сустрэча кіраўніцтва Беларускай федэрацыі футбола з прадстаўнікамі міліцыі, футбольных клубаў сталіцы і іх балельшчыкамі.

У выніку стала вядома, што МУС гатова прыбраць сваіх супрацоўнікаў са стадыёнаў, аднак міліцыянеры працягнуць ажыццяўляць надгляд на ўваходзе на арэны. Бакі дамовіліся таксама, што на пунктах надгляду ўпаўнаважаныя прадстаўнікі федэрацыі маюць права весці незалежную відэаздымку, якая можа быць выкарыстана ў выпадку ўзнікнення якіх-небудзь спрэчных сітуацый.

І яшчэ адно новаўвядзенне чакае аматараў футбола. Пры выкананні пэўных заканадаўчых патрабаванняў (арганізацыі стацыянарных кропак продажу) на стадыёнах можна будзе ажыццяўляць рэалізацыю піва.

“Што тычыцца міліцыі, то, на мой погляд, прынялі правільнае рашэнне, – лічыць чэмпіён СССР 1982 года ў складзе мінскага Дынама **Валерый МЕЛЬНІКАЎ**. – *Я разумею, што меры бяспекі – гэта неабходная рэч, але ж трэба думаць і пра балельшчыкаў, якія ідуць на стадыёны футбол глядзець, а не ўступаць у нейкія канфлікты. Такое супрацьстаянне не патрэбна нікому”*.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ПОЗДРАВЛЯЕМ!

Самое качественное обслуживание – в РНПЦ онкологии

Республиканский научно-практический центр онкологии и медицинской радиологии им. Н.Н.Александрова – победитель смотра качества и культуры медицинского обслуживания населения за 2015 год. Центр стал лучшим среди всех организаций здравоохранения республиканского подчинения.

Министр здравоохранения **Василий Жарко** вручил диплом директору центра **Олегу Суконко**.

Фото: medvestnik.by



ДИПКУРЬЕР

Нужна виза в Польшу?

С 1 марта Посольство Республики Польша в Республике Беларусь и VFS Global открывают визовые центры в Минске, Бресте, Гродно и Гомеле.

«Резиденты Республики Беларусь смогут подать заявление на получение визы в Польшу и сдать биометрические данные в одном месте и в дружелюбной обстановке, – комментируют эту информацию в Посольстве Польши в Беларуси. – *Через месяц точно такие же центры появятся и в других городах Беларуси: Лиде, Барановичах, Пинске и Могилеве».*

“Открытие визовых центров значительно облегчит процесс получения польской визы для граждан Беларуси», – сказал Временный Поверенный в Делах Республики Польша в Республике Беларусь **Михал Хаброс.**

АФІЦЫЙНА

Колькі дзён будзем адпачываць у сакавіку?

Працоўны дзень з панядзелка 7 сакавіка пераносіцца на суботу 5 сакавіка. Такім чынам атрымліваецца тры дні выходных – з 6 па 8 сакавіка.

Наступныя вялікія выходныя будуць у маі.

Сёлета Радаўніца будзе адзначацца 10 мая, адпаведна, выходныя будуць доўжыцца з 7 па 10 мая.


ТАКОЕ ЖЫЦЦЁ

Бяднеем…

Белстат паведаміў, што ў студзені сярэдні заробак «бруднымі» ў работнікаў арганізацый краіны склаў **6 мільёнаў 551 тысячу 585 рублёў**, рабочых і служачых – **6 мільёнаў 587 тысяч 462 рублі.** Гэта менш снежаньскіх паказчыкаў на 872 тысячы 507 рублёў!

Што характэрна: заробкі беларусаў (у рублях, не доларах) упалі, і памер сярэдняй зарплаты ў студзені 2016-га склаў 97,4% да ўзроўню студзеня 2015 года. Атрымліваецца, што на фоне таго, як растуць цэны, дэвальвіруецца нацыянальная валюта, зарплаты зніжаюцца. Пра абяцаную сярэднюю зарплату ў тысячу долараў – а сёння гэта прыкладна 21,6 мільёна рублёў – ніхто ўжо ў высокіх кабінетах і не ўзгадвае.

Што тычыцца студзеньскіх заробкаў па рэгіёнах, то карціна выглядала так:



ДАРЭЧЫ

Зарплаты ў Польшчы наблізіліся да тысячы еўра

Галоўнае статыстычнае ўпраўленне Польшчы не так даўно апублікавала дадзеныя па зарплатах у сваёй краіне. Іх адлічэння падаткаў сярэднестатыстычная зарплата ў Польшчы ў 2015 годзе склала 3899 злотых 78 грошаў, альбо прыблізна 885 еўра. Але гэта сярэднегадавая лічба. К канцу 2015 года, згодна з усё той жа афіцыйнай статыстыкай, сярэдні заробак у палякаў вырас да 916 еўра.

А вось у Расіі, як і ў нас, зарплаты падаюць. Сярэднямесячная намінальная заработная плата ў нашай усходняй суседкі складае сёння 33.347 рублёў, што адпаведна з курсам расійскага рубля – усяго толькі каля 440 долараў. Зусім малыя грошы за сваю працу атрымліваюць украінцы. Дзяржаўная служба статыстыкі Украіны дае такія лічбы сярэдняй зарплаты па краіне (без уліку частак Данецкай і Луганскай абласцей): 5,23 тысячы грыўнаў, што адпавядае прыблізна 200 долараў.

А вось у Літве сярэдні заробак у адпаведнасці з падаткамі складае 735 еўра, у Эстоніі – 1045 еўра.

Марыя ЭЙСМАНТ.

САЛІДАРНАСЦЬ

Бацькам Міхаіла Жызнеўскага прызначана пажыццёвая пенсія ад Украіны

Днямі такое рашэнне было прынята ўкраінскім урадам.

Бацькі Героя Нябеснай Сотні Міхаіла Жызнеўскага будуць атрымліваць грашовую дапамогу ў памеры 3 тысяч 250 грыўняў кожнаму (больш за 2,5 мільёна беларускіх рублёў). Усе выдаткі па пераводзе пенсіі ў Беларусь будзе аплачваць украінскі бок.

– *Мы пакуль нічога не афармлялі і не атрымлівалі*, – сказала «Народнай Волі» маці загінуўшага беларуса Ніна Жызнеўская. – *Больш за ўсё я хацела б, каб Міша быў прызнаны Героем Украіны. Мне падаецца, што гэта абароніць ягоную магілу ў Беларусі ад вандалаў.*

Як неаднаразова пісала «Народная Воля», магілу Міхаіла Жызнеўскага некалькі разоў апаганьвалі: зрывалі беларускія і ўкраінскія стужкі, пашкодзілі помнік. У міліцыі знайсці правапарушальнікаў не атрымалася.

Нагадаем: беларус Міхаіл Жызнеўскі быў забіты выстралам у сэрца ў студзені 2014 года. Гэта адбылося падчас сутыкнення дэманстрантаў Еўрамайдана і атрадаў «Беркута» на вуліцы Грушэўскага ў Кіеве. У лістападзе 2014 года беларус быў узнагароджаны ордэнам Героя Нябеснай сотні, які прэзідэнт Украіны Пётр Парашэнка ўручыў ягоным бацькам.

Міхаіл Жызнеўскі пахаваны пад Гомелем.

Раман ВАСЮКОВІЧ.

ВОЗВРАЩАЯСЬ К НАПЕЧАТАННОМУ

Засада-2, или Давайте назовем чиновников поименно…

Когда приходится возвращаться к опубликованному материалу, к уже поставленной проблеме, на которую к тому же получено реагирование из госучреждения, очевидным становится, как запутанно, неповоротливо, а порой и просто бестолково ведутся дела в чиновничьем аппарате. Как тяжелы жернова административного производства. Как лживы и увертливы должностные лица. Какие ледяные ветры равнодушия дуют там в кабинетах. И как вообще довольно бесталанна эта каста – административная прослойка общества, работа которой оплачивается из наших налогов.

Второй раз газета вынуждена обращаться к вопросу обустройства подъезда к жилым домам в деревне Декшняны Молодечненского района. Дороги той всего около километра. То есть это не путь из варяг в греки, не трасса М1, не мегамагистраль Брюссель–Пекин. Это маленькая сельская грунтовка длиной в 900 метров к хутору из трех домов. Но для их жителей эти метры – дорога жизни. И объяснять это, надеюсь, никому не нужно.

Тем не менее вопрос об устройстве сельской колеи не может сдвинуться с места пятый месяц подряд. Причем все начальники от мала до велика на жалобы **Тамары Иосифовны Сугоняко** дают положительный ответ с подарочным набором успокоительной лексики: «*принято решение*», «*установлено*», «*вопрос находится в компетенции*», «*работы по обеспечению будут выполнены*». [illegible]

безграничного, холодного, недоступного, как космос, бюрократического океана.

Набрав в легкие побольше воздуха, попробуем все-таки нырнуть в эту бездну и увидеть конкретные должностные лица, обитающие в высоких сферах.

Начнем с еще более-менее теплых слоев. Председатель Радошковичского сельсовета **Виктор Станиславович Капацевич**. Кому как не ему знать и переживать за насущные проблемы односельчан, соседей? Но, услышав мой голос в телефонной трубке, Виктор Станиславович просто отключил мобильную связь. Нужны комментарии? И чего ж вы так испугались, товарищ председатель?..

Начальник землеустроительной службы Молодечненского райисполкома **Дмитрий Александрович Клопов**. Именно в его ведении должно находиться землеустроительное дело фермерского хозяйства Е.А.Троцкой, по земле которой исторически проходила сельская колея к хутору Тамары Иосифовны Сугоняко.

Теперь колея фермерами запахана, дорога исчезла. И землеустроительное дело отсутствует. Нет его в архиве. Хитро. А может, халатно? Ведь в данный момент нет возможности доказать, что землю фермеру в 2005 году выделили с нарушением – не нанеся на проект подъездной путь к трем домам на хуторе Декшняны. Да, землеустроитель Клопов с корреспондентом по телефону разговаривает свободно, вежливо. Бросать трубку – ему не комильфо по ранжиру. Философски замечает, что земельный вопрос – самый трудноразрешимый из века в век. Не стану спорить. Но кто виноват в данном конкретном случае, Дмитрий Александрович?

Дальше начинаются плотные слои чиновничьих атмосфер. К ним по мобильнику не пробьешься, туда, чтобы поговорить с начальником, надо записываться на прием. Или послать жалобу почтой. [illegible] **А.Д.Язнович**, когда у него в

кабинете была Тамара Сугоняко, в овсы проблему не уводил (все-таки управленческий опыт), признал отсутствие сельской колеи. А после выступления «Народной Воли» послал в газету, как и самой Тамаре Сугоняко, письмо. Это было еще в середине декабря прошлого года. В письме подтверждается, что «*вопрос устройства подъезда к жилым домам в д.Декшняны (хутор) неоднократно рассматривался с выездом на место*». Неоднократно… Обнадеживающее, но бесплодное времяпрепровождение. Где результат, хозяин? Скоро на дворе весна!

Вопрос о 900 метрах сельской колеи в Декшнянах рассматривался также в Государственном комитете по имуществу – в пределах своей компетенции. Заместитель председателя комитета **В.А.Абрамов** ответил Т.Сугоняко следующим элегантным образом: «*По вопросу бездействия Молодечненского районного исполнительного комитета [illegible] подъезда к жилым домам № 81, 81А, 81Б в д.Декшняны Вы вправе обратиться в Минский облисполком и (или) в суд*». Как говорится, ни холодно ни жарко. А может быть, лучше сразу в ООН?

Прокурор Молодечненского района старший советник юстиции **В.В.Дубовский** тоже стоит на защите права Сугоняко иметь грунтовую дорогу к своему дому. В его письме от 30 ноября прошлого года черным по белому написано следующее: «*… участок под проезд будет выделен из числа пахотных земель, предоставленных в пожизненное наследуемое владение Троцкой Е.А. В ближайшее время решение об изменении границ участка Троцкой Е.А. будет принято Молодечненским районным исполнительным комитетом*». Ну маслом по сердцу. Бальзамом на душу. Мыслию по древу.

Но ведь до сих пор там конь не валялся.

Страшно сказать – Тамара Иосифовна Сугоняко смогла даже выбраться на «околоземную орбиту» – побывать на приеме у заместителя председателя облисполкома **С.П.Невмержицкого**. И тоже, что характерно, вполне себе положительно – зампредседателя, как пишут в романах, понял ее боль. Вскоре женщине пришел прекрасный ответ от и.о. генерального директора «Минскоблстроя» **В.И.Мелешко**: «*Принято решение произвести устройство подъезда по существующей грунтовой дороге вдоль поля*».

Это было 3 ноября. То есть вчера. Нет? Не вчера, а четыре месяца назад? Ну, тогда – ау, люди, вы где? Начальники, вы на календари смотрите? Вы вообще нас слышите? Вы наши простые нужды понимаете? Ведь Тамара Иосифовна Сугоняко, маленькая немолодая женщина, жительница хутора в Молодечненском районе, истратив огромные силы на преодоление чиновничьих атмосфер, скоро сгорит, как ракета, из-за трения с «письмами счастья» от высших должностных лиц. И – нет человека, нет проблемы. Ответьте, вы этого добиваетесь?

Елена МОЛОЧКО.

ГРОМКОЕ ДЕЛО

Сергею Сидько удалили почку



Сергей Сидько в суде.

*В последнее время наметилась любопытная тенденция: осужденных за коррупцию чиновников досрочно освобождают и трудоустраивают на предприятия, которые не блещут успехами. «Народная Воля» поинтересовалась, не вышел ли из колонии бывший председатель Белкоопсоюза **Сергей Сидько**, которого признали виновным в неоднократном получении взяток, злоупотреблении властью и приговорили к 12 годам лишения свободы.*

– Нет, муж не вышел на свободу, он отбывает наказание в Витебской колонии «Витьба», – *рассказала «Народной Воле» супруга бывшего чиновника Татьяна.* – Врачи обнаружили у него онкологию, в январе ему удалили правую почку. Операцию делали в Витебском онкологическом диспансере – он там под охраной лежал, увидеться с ним было невозможно. Он еще во время суда жаловался на здоровье – даже прерывали судебное заседание, его забирали на обследование.

Сейчас пытаюсь решить проблемы с медицинскими посылками. Мы отправляем ему лекарства, а посылки возвращаются обратно – говорят: то разрешения нет, то не положено. Хотя после операции ему рекомендовали прием определенных лекарств.

Прошение о помиловании на имя А.Лукашенко Сергей Сидько не писал. Пока он пару недель назад только подал надзорную жалобу в Верховный суд.

– Я знаю, что некоторых бывших чиновников освобождают и трудоустраивают, и лично я готова вместе с мужем и в самый захудалый колхоз поехать, но мы с ним этот вопрос еще не обсуждали: после операции еще не виделись, – *говорит Татьяна Ливерьевна.* – Нам сейчас положены только длительные свидания по графику, письма и раз в десять дней ему разрешены звонки. Правда, эти звонки очень короткие – минута-две, но это все равно большое дело…

Марина КОКТЫШ.

ПОИМЕННО

Пока известно о пяти бывших чиновниках, осужденных за коррупцию, но освобожденных досрочно с последующим трудоустройством на руководящие должности

Так, бывший заместитель генерального прокурора **Александр Архипов,** осужденный на шесть лет лишения свободы за получение взятки, сейчас руководит РСУП «Петровичи».

Бывший председатель Чашникского райисполкома **Владимир Булай**, которого обвинили в злоупотреблении властью или служебными полномочиями, назначен директором ОАО «Кленовичи».

Бывший заместитель председателя Барановичского горисполкома **Игорь Стасевич**, осужденный 16 июня 2014 года на три года лишения свободы за превышение власти, с февраля работает директором Барановичского комбината надомного труда.

Бывший гендиректор ОАО «Могилевдрев» **Андрей Усов,** осужденный 1 июля 2014 года на восемь лет лишения свободы за злоупотребление служебными полномочиями, хищение имущества и служебный подлог, назначен исполнительным директором по производству ОАО «Могилевский завод Строммаш».

Бывший заместитель председателя концерна «Белнефтехим» **Владимир Волков,** осужденный 15 августа 2014 года за получение взятки в особо крупном размере на восемь лет лишения свободы, в этом месяце освободился досрочно – его назначили руководителем дирекции строящихся объектов Новополоцкого нефтеперерабатывающего завода.

НУ І НУ!

Хочаш на ўнітаз? Давай дакумент…

Пра тое, як добрую ідэю можна давесці да абсурду.



Дваццаць пяць гадоў я ведаю Іосіфа Паўлавіча Сярэдзіча. На якія толькі штучкі-дручкі ён не здольны! Але ніколі не чакаў, што ў канцы працоўнага дня выкліча ў кабінет і катэгарычна загадае:

– *Заўтра, Алесь, як толькі прачнешся – не суньса ў свой сямейны туалет, а дуй у грамадскую прыбіральню, што ў пераходзе станцыі метро "Малінаўка". Ты жывеш побач, спадзяюся, дабяжыш, не напусціш…*

Раніцай я сапраўды рвануў па ўказаным адрасе. Рэдактарскаму заданню і майму візіту на "стратэгічны аб'ект" папярэднічаў тэлефонны званок у рэдакцыю мінчанкі **Ларысы Васільеўны Івановай.**

"У пераходзе станцыі метро "Малінаўка" вырашыла зайсці ў прыбіральню, – распавяла яна. – *На ўваходзе была абвестка, што для інвалідаў (а я – інвалід II групы) паслуга бясплатная. Паказала пасведчанне, але аказалася, што не ўсё так проста. Жанчына-касір запатрабавала пасведчанне, каб… перапісаць звесткі пра мяне ў спецыяльны журнал. Сказала, што ёсць такое распараджэнне начальства. Шчыра кажучы, з такой дурасцю я сутыкаюся ўпершыню. Хацела звярнуцца з гэтай нагоды да кіраўніцтва ўнітарнага прадпрыемства "Малыя архітэктурныя формы" (гэта ім належыць вышэйзгаданая прыбіральня), але мне сказалі, што дырэктар прымае толькі раз на тыдзень…"*

Напачатку не паверылася, што такое можа быць, але пасля візіту на "аб'ект" інфармацыя пацвердзілася. На ўлік бяруць усіх інвалідаў, якія зайшлі на агеньчык зрабіць "сваю справу".

З гэтай нагоды ўспомніліся апублікаваныя факты пра тое, як у былыя часы заходнія спецслужбы сачылі за савецкімі кіраўнікамі. Аказваецца, падчас нейкіх візітаў партыйных босаў за мяжу ў нумарах гатэляў, дзе яны спыняліся, былі спецыяльныя прыбіральні. І калі нейкі дзеяч спраўляў патрэбу, а пасля змываў ваду, то яго "рэшты" траплялі не ў каналізацыю, а ў загадзя падрыхтаваныя кемлівымі спецслужбамі мяшэчкі. Затым ужо іх змест уважліва аналізаваўся спецыялістамі, якія і ставілі канчатковы дыягназ здароўю і нават характару чалавека. Як кажуць: пакажы мне свае аналізы, і я скажу, хто ты.

Дык, можа, і ў сталічных прыбіральнях беларускія спецслужбы вырашылі праверыць аналізы інвалідаў? Глядзіш – пасля праверкі, прабачце, мачы ці калу высветліцца, што ў чалавека не другая група інваліднасці, а трэцяя. Ужо дзяржаве менш плаціць трэба. А як яшчэ патлумачыць той факт, што ў прыбіральнях зладзілі перапіс асобнай катэгорыі насельніцтва? Гэта рэжымныя аб'екты? Вярхоўны суд? Адміністрацыя прэзідэнта? Прабачце, але калі чалавека моцна "прыціснула", то ля акенца і ў штаны накласці можна, пакуль касір будзе перапісваць звесткі. Здавалася б, пакажы пасведчанне – і міласці просім. Дык не, трэба завесці на чалавека цэлае "дасье"…

Дарэчы, некаторыя супрацоўнікі прадпрыемства "Малыя архітэктурныя формы", калі даведаліся, якую тэму вырашыла ўзняць "Народная Воля", толькі ўзрадаваліся гэтаму: *"Абавязкова напішыце! Не так даўно да нас прыйшоў новы кіраўнік Віталь Сульжыцкі, гэта ён фантаніруе такімі ідэямі. Яго сто разоў прасілі, каб адмяніў перапіс інвалідаў. Людзі трымаюць свае пасведчанні ў цэлафанавых пакецках ля сэрца. Некаторым на нагах стаяць складана, а трэба дастаць яшчэ дакумент, аддаць касіру і чакаць, пакуль ён перапіша ўсе звесткі. І гэта дзеля таго, каб проста справіць патрэбу. Ну ці не здзек са сталых людзей?! Ці ж яны такое заслужылі?"*

Звярнуліся мы за каментарыем і да самога **Віталя Сульжыцкага.**

"Так, чалавек павінен паказаць пасведчанне, каб скарыстацца бясплатнай паслугай, – паведаміў ён. – *Але ў мяне няма інфармацыі, што перапісваюць звесткі з пасведчанняў ільготнікаў. Можа быць, не перапісваюць, а проста пазначаюць, да якой ільготнай катэгорыі чалавек адносіцца. Таму што з гэтай нагоды вядзецца ўлік, збіраецца інфармацыя пра наведвальнікаў. А наконт перапісу… Можа, гэта быў нейкі адзінкавы выпадак? Я разбяруся і даведу да касіраў, каб не даводзілі справу да абсурду".*

Дык што, атрымліваецца, што начальнік увогуле не ведае пра праблему?

Будзем спадзявацца, што ганебную практыку перапісу людзей у прыбіральнях кіраўнік прадпрыемства з гучнай назвай "Малыя архітэктурныя формы" ўсё ж адменіць. Бо ад усёй гэтай гісторыі дрэнна патыхае…

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ЗА ПРОХОДНОЙ

Иосиф СВИСТУНОВ, директор ОАО «Сенненский райагросервис»: «Задолженности убыточных хозяйств легли на нас…»

В открытом акционерном обществе «Сенненский райагросервис» работает более 400 человек. Уже несколько месяцев предприятие не может выплатить людям зарплаты.

Экономические проблемы на предприятии начались осенью прошлого года. Работникам стали задерживать заработную плату, а вместо денег руководство предложило отовариваться продуктами в магазине. Некоторые подали заявления на увольнение, но большая часть коллектива осталась на предприятии. Трудоустроиться в регионе сейчас проблематично.

– *У людей непогашенные кредиты, кто-то детей платно учит*, – рассказывают работники убыточного предприятия. – *Задолженности по деньгам за несколько месяцев. Время от времени выплачивают по 300–400 тысяч.*

Какие действия руководство предприятия намерено предпринять в ближайшее время? На этот вопрос «Народная Воля» попросила ответить директора ОАО «Сенненский райагросервис» **Иосифа Свистунова.**

– *Задолженность по зарплате есть, это правда*, – сказал Иосиф Станиславович. – *Главные причины такого положения – это присоединение к агросервису убыточных хозяйств: их задолженности легли на нас. У меня работает 452 человека, которым нужно выплатить зарплаты. Как выйти из этого положения, я затрудняюсь ответить. Нужно начинать разбираться с ценообразованием на производстве. Мы литр молока на завод продаем за 4,5 тысячи, а в магазине этот же литр стоит 14.300! Меня постоянно штрафуют за невыплату зарплат. Получается, что один я виноват в сложившейся ситуации?*

Как уже сообщала «Народная Воля», в непростом экономическом положении находится и экспериментальная база «Тулово», что в Витебском районе. Из-за присоединения убыточных хозяйств у предприятия возникли немалые задолженности перед работниками.

Роман ВАСЮКОВИЧ.

СПЕЦЫЯЛЬНЫ РЭПАРТАЖ



«Апошнюю радасць у жыцці адбіраюць!»

Карэспандэнт «Народнай Волі» схадзіў у наваполацкую лазню і паглядзеў, ці ёсць жадаючыя памыцца па новых коштах.

Прыходжу ў лазню ў нядзелю і накіроўваюся ў касу. Некалькі месяцаў таму наваполачане набывалі квіткі за тыдзень да меркаванага візіту.

Цяпер кошт квітка ў наваполацкую лазню №2 складае 80 тысяч (яшчэ напрыканцы мінулага года схадзіць на двухгадзінны сеанс можна было за 50 тысяч). А паход у грамадскую лазню №1 абыдзецца і ўвогуле ў 100 тысяч рублёў.

– *Зараз свабодных месцаў дастаткова*, – кажа касір, працягваючы білет. – *Менш людзей стала хадзіць.*

Наведвальнікаў у мужчынскім аддзяленні сапраўды няшмат. З 40 кабінак для пераапранання занята крыху больш за 10. Паводле слоў пастаянных кліентаў, падвышэнне цэн сур'ёзна адбілася на бюджэце жыхароў Наваполацка – цяжка ўзгадаць, калі ў выхадны дзень было амаль пустое аддзяленне. Як стала вядома «Народнай Волі», лютаўскае павышэнне коштаў – не апошняе.

– *На першы погляд 80 тысяч і грошы невялікія*, – кажа Вадзім, які працуе кіроўцам. – *Але калі ўсёй сям'ёй хадзіць кожны тыдзень, то атрымліваецца немаленькая сума. Трэба ж яшчэ і венік купіць, і ў буфет зайсці пасля лазні. Я раней кожны тыдзень хадзіў, а цяпер хаця б пару разоў у месяц…*

Цэны на бярозавыя і дубовыя венікі пачынаюцца ад 20–30 тысяч. Праўда, у мэтах эканоміі некаторыя нарыхтоўваюць венікі самастойна ў летні перыяд.

Нават без наведвання кафэ паход у лазню складзе 100 тысяч, і не кожная сям'я ў Наваполацку гатова сёння выдаткаваць 300–400 тысяч на аздараўленне па выхадных. Дарэчы, пастаянным кліентам у бліжэйшы час наўрад ці атрымаецца пасля лазні выпіць куфель піва або кубак гарбаты. У нядзелю буфет быў зачынены, і, як даведаўся карэспандэнт «Народнай Волі», малаверагодна, што ён адновіць работу. Невялікая наведвальнасць адбілася і на даходах мясцовага кафэ.

Найбольш папулярная тэма ў размовах паміж наведвальнікамі лазні – невялікія зарплаты і рост цэн на прадукты і паслугі. Больш за ўсё ад падаражання грамадскіх лазняў пацярпелі людзі пенсіённага ўзросту. Паводле слоў наваполацкага пенсіянера, які назваўся Мікалаем Сяргеевічам, многія яго знаёмыя наогул перасталі наведваць лазню, бо ўсе льготы даўно скасаваны, а плаціць 80 тысяч не па кішэні.

– *Апошнюю радасць у жыцці адбіраюць!* – з сумнай усмешкай кажа пенсіянер з Наваполацка. – *Больш за 40 гадоў адпрацаваў у гэтым горадзе – і ў старасці ў лазню не магу схадзіць!.. Я хадзіў рэгулярна, але такія грошы цяпер ужо наўрад ці змагу плаціць. Прыходзіцца выбіраць: альбо ў краму, альбо ў лазню. Слава Богу, ёсць дача за горадам. Падлічыў, што танней ездзіць туды і мыцца ў сваёй старэнькай лазні.*

АФІЦЫЙНА

Аляксей ЛАРЫН: «Хто можа, той і наведвае»


Пракаментаваць сітуацыю з наведвальнасцю грамадскіх лазняў у Наваполацку «Народная Воля» папрасіла дырэктара дзяржаўнага прадпрыемства «Наваполацкводаканал» Аляксея Ларына.

– Пакуль рана рабіць нейкія высновы, – *сказаў Аляксей Генадзьевіч.* – Прайшоў толькі тыдзень пасля ўзняцця коштаў на квіткі. Таксама рана казаць аб нерэнтабельнасці або закрыцці лазні ў горадзе. На парадку дня такое пытанне не стаіць. Хто можа купіць квіток, той і наведвае лазню.

Раман ВАСЮКОВІЧ.
Фота аўтара.

ПАСЛЯ ПАДЗЕІ

Аляксей ДУДАРАЎ: «Я быў закаханы ў Барбару»



У Купалаўскім тэатры прайшоў трохсоты спектакль «Чорная панна Нясвіжа» паводле п'есы Аляксея Дударава. Гэта паэтычная элегія, беларуская гісторыя пра Рамэа і Джульету, якую паставіў у 2000 годзе былы галоўны рэжысёр тэатра народны артыст Валерый Раеўскі. А ставіць пра любоў Валерый Мікалаевіч умеў… З тых часоў вось ужо 15-ы год запар прыгожы касцюмны спектакль збірае залу. Першую Барбару Радзівіл выдатна выконвала Святлана Зелянкоўская, у трохсотым спектаклі на сцэну выйшла маладая актрыса Валянціна Гарцуева. І вобраз ліцвінкі, якая шэсць месяцаў была каралевай Польшчы, узбагаціўся ў яе выкананні новымі фарбамі. У Гарцуевай ёсць пафас, арыстакратызм, вытанчанасць. Менавіта ў такую Барбару і быў закаханы, па яго ўласным прызнанні, Аляксей Ануфрыевіч Дудараў.

– Як прыйшла ў вашу творчасць, Аляксей Ануфрыевіч, Барбара Радзівіл? Вы бывалі ў Кракаве?

– Сорамна прызнацца, але я і ў Нясвіжы пабываў пасля таго, як напісаў п'есу! Справа не ў тым, быў ці не быў, а ў тым, што трэба адчуць і палюбіць свайго героя ці гераіню. А тое, што я ў Барбару быў закаханы, як і ўсе ліцвіны, у гэтым і пытання няма. Калі скончыў п'есу, перадрукаваў яе і цягнуў, цягнуў здаваць… Мне было цяжка з ёй развітвацца.

– Вы памятаеце прэм'еру?

– Памятаю, канешне. Памятаю, што на прэм'еры казала мне светлай памяці народная артыстка Лілія Міхайлаўна Давідовіч, якая іграла Бону Сфорцу: "Лёшачка, я так табе ўдзячная, што хоць пад канец жыцця пахаджу па сцэне ў прыгожых сукенках!"

– П'есу вам заказвалі?

– Не, я прачытаў брашурку аб Нясвіжы, дзе гэта гісторыя была расказана тэзісна. Тое, што Бона атруціла Барбару, мне адразу не легла на душу. Паводле маёй версіі, Барбара атруцілася сама. Праз памылку. А як было на самай справе, гэтага ніхто не ведае. Але самае галоўнае, што такіх гістарычных персон, як Барбара Радзівіл, як Рагнеда, такіх, як Вітаўт, зараз трэба апаэтызаваць. Да, нельга па творах мастакоў вывучаць гісторыю. Ні па карцінах, ні па п'есах. А любіць – можна. Таму што ў мастацкім вымысле больш праўды, чым у самой праўдзе.

– Вы хацелі напісаць шэдэўр? Наогул, ці трэба аўтару ставіць такую задачу?

– Калі ты садзішся пісаць шэдэўр, значыць, ты графаман. Я садзіўся працаваць. Што такое каханне, ніхто з нас не ведае. Але ўсе адчуваюць. Так і з п'есай пра Барбару Радзівіл. Мне было прыемна прысутнічаць пры вялікім каханні.

– У той час, напрыканцы 1990-х, я памятаю, у вас была ідэя зняць фільм пра князя Вітаўта. Аднак праект не атрымаў падтрымкі з боку дзяржавы.

– Гэта быў вельмі дарагі касцюмны праект – грошай у дзяржавы не было. А здымаць фільм хацеў Міхаіл Пташук. І сцэнарый я ўжо напісаў. Здаецца, недзе ён і ёсць, калі пашукаць. Вельмі дарагі праект.

– Так і кінематограф краіны – не Дом культуры. Але я вось аб чым: пра Барбару вы ўзяліся пісаць з-за адмовы Мінкульта здымаць фільм аб Вітаўце?

– Цалаваць ад злосці? Не! У мяне было і зараз ёсць памкненне, каб усе нашы гістарычныя асобы выйшлі на галоўныя сцэны страны: у Вялікім тэатры, у Купалаўскім, у Тэатры юнага гледача… Штосьці мне ўдалося зрабіць…

– То бок п'еса не ад болю ішла, а ад радасці?

– Не ад болю. Мне цікава было знаходзіцца там, у сярэднявеччы, цікава было кантактаваць з гэтымі героямі. Я заўсёды жыву па-прынцыпе: "рабі, што павінен, і будзь, што будзе". Глядач п'есу прыняў. Таму што 300 разоў цягнуць п'есу на сцэну "па блаце", без любові гледачоў немагчыма. І калі пра Вітаўта, Рагнеду, Барбару Радзівіл яшчэ напішуць дзесяць разоў, гэта будзе нармальна. Гісторыя для народа не менш важная, чым сучаснасць. Таму што і гісторыя, і сучаснасць робяць будучыню.

– А ў чым сэнс тэатра для гледача? Бо можна і без тэатра быць маральным і шчаслівым...

– Звычайнае жыццё – яно не вельмі цікавае. Хочацца падняцца на катурны. Ва ўсім. І таму людзі прыдумалі тэатр.

– Наколькі грэшным мае права быць пісьменнік? Ці, наадварот, наколькі святым ён павінен быць, каб мець маральнае права пісаць?

– Я толькі адно магу сказаць: жыві, як пішаш, пішы, як жывеш. Але тыя плямы, якія ёсць на табе, абавязкова вылезуць у творчасці.

Алена МАЛОЧКА.

SOS!

Пришло метро – возникли проблемы с водой

Строительство третьей ветки метрополитена принесло некоторым минчанам лишь проблемы: в их домах серьезно уменьшилась подача воды.

С этой проблемой столкнулись жители домов №2 по улице Максима Танка и №3 по Мельникайте (в редакции имеется письмо с 38 подписями проживающих в них). По словам минчан, с середины января 2016 года эти дома перевели из зоны подачи воды высокого давления в зону низкого давления. В результате давление воды на входе в дом снилось с 6 до 1,8 атмосферы. После обращений в местный ЖЭС-62 и «Минскводоканал» давление несколько увеличилось и составило 2,2 атмосферы (а в часы повышенной нагрузки – 2,4 ат).

Но жители двух домов считают такие меры недостаточными. Согласно нормам по питьевому водоснабжению, минимальное давление воды в часы пиковой нагрузки должно составлять 2,6 атмосферы на пятиэтажный дом. Кроме того, жильцы столкнулись с рядом бытовых трудностей. По словам минчан, из-за слабого напора воды они не могут полноценно принять душ и ванну (особенно утром, вечером и в выходные, когда большинство жильцов находится дома). Не работают стиральные и посудомоечные машины, пятиступенчатые фильтры очистки воды. Недостаточный напор воды препятствует запиранию сливной системы бачков унитазов. Существуют проблемы и с горячей водой. В домах нет централизованного горячего водоснабжения. Поэтому холодная вода поступает в бойлер, а уже затем в квартиры. Поэтому напор напрямую зависит от давления подаваемой воды.

В «Минскводоканале» жильцам сообщили, что перевод домов из зоны подачи воды высокого давления в зону низкого давления не временный. То есть возврата к былому состоянию не будет.

«Народная Воля» обратилась за комментариями в соответствующие организации. Директор ЖЭС-62 **Максим Федоров** объяснил, что в курсе сложившейся проблемы. Но, по его словам, ЖЭС не отвечает за этот вопрос. Наружными сетями занимается «Минскводоканал». В приемной этой организации корреспондента «Народной Воли» переадресовали к начальнику производства «Минскводопровода» **Михаилу Щурко**. Но тот от комментариев отказался.

Как сообщила «Народной Воле» **Ольга Пархимович**, которая проживает в доме по улице Мельникайте, в «Минскводоканал» отправлено как ее личное обращение, так и письмо за подписью жильцов. Ответ на первое должен прийти 25–26 февраля, на второе – к 1 марта. Возможно, только тогда станет известно, почему в центре Минска из-за строительства метро люди не могут нормально принять душ.

Максим ПЛОТНИКОВ.

ТУРЫЗМ-2016

Як туркі прываблiваюць беларускіх турыстаў

Ці адмовяцца ў гэтым годзе беларусы ад адпачынку на курортах Турцыі і Егіпта?



Апошнім часам падзеі, якія адбываюцца ў свеце, зрабілі турэцкі і егіпецкі турыстычныя накірункі не зусім небяспечнымі. Ці вымусіць турыстаў гэты факт не ехаць сёлета на курорты ў Турцыю і Егіпет?

– Так атрымалася, што гэтыя накірункі і на самай справе сталі ў пэўным сэнсе небяспечнымі, – кажа эксперт у галіне турызму **Лілія КОБЗІК**. – Для беларускага турыстычнага рынку гэта вялікая страта, бо для нашага турыста менавіта гэтыя краіны былі самыя прывабныя і звыклыя для адпачынку. Але зараз імідж абодвух накірункаў сапсаваны. Сёння ў Егіпет застаецца адзін "ланцужок" на Хургаду, але загружаюцца рэйсы слаба. Думаю, такая сітуацыя працягнецца. Што тычыцца Турцыі, дык туды запланаваны дастаткова вялікі аб'ём перавозак турыстаў. Але галоўнае пытанне – ці пагодзяцца беларусы ляцець? Калі абапірацца на рынак, дык попыт зменшыцца, хоць пра дакладныя лічбы казаць пакуль немагчыма. Зараз у Турцыі быццам бы сітуацыя стала больш спакойная, але ж зразумела, што агульная атмасфера дрэнная. Турыст хоча заплаціць грошы за адпачынак і наогул не думаць пра сваю бяспеку. Да таго ж сёння ў Беларусі ўзровень жыцця знізіўся, заробкі не растуць, а таму чалавек сто разоў падумае, ці варта яму адпачываць у гэтым годзе. Дарэчы, цяпер у Беларусь прыязджае шмат прадстаўнікоў турэцкіх гасцініц і туркампаній, каб нейкім чынам паказаць прывабнасць свайго накірунку. Маўляў, не ўсё так дрэнна, як малююць. Туркі кажуць, што ўзмацнілі меры бяспекі ў гатэлях, аэрапортах, палепшылі сэрвіс… Таму ні турэцкі, ні беларускі бок не губляюць надзеі, што турысты будуць. Невядома толькі, колькі іх налічыцца. Але адно можна сказаць з упэўненасцю: у нас не будзе расійскай сітуацыі, таму што расіянам увогуле забаранілі лятаць у Турцыю і Егіпет.

– У такім выпадку для беларускіх турыстаў, магчыма, знізяцца і цэны на пуцёўкі на гэтых накірунках?

– Ужо зараз можна канстатаваць, што выбар цэн вялізны і можна знайсці для сябе бюджэтны варыянт. Думаю, што і падчас сезона будуць спецыяльныя прапановы. Некаторыя турэцкія атэльеры не зніжаюць цэны, але дадаюць за той жа кошт куды больш паслуг і сэрвісу. Напрыклад, калі муж і жонка набылі дзве пуцёўкі, дык адпачынак для дваіх дзяцей будзе ўжо бясплатны. Вельмі шмат розных акцый! Туркі таксама напалоханы, бо турыстычны рынак сціснуўся. Кліентаў стала менш, а таму прывабных прапаноў – больш.

Алесь СІВЫ.

КВАТЭРНАЕ ПЫТАННЕ

Трохпакаёвая кватэра ў Віцебску каштуе танней за 40 тысяч долараў

Кошт кватэр у абласным цэнтры знізіўся на 40 працэнтаў. Гэта самы вялікі паказчык сярод іншых гарадоў Беларусі.

У мінулым годзе на рынку нерухомасці ў Віцебскім рэгіёне адбыўся абвал цэн. Адной з прычын рэзкага падзення кошту жылля з'яўляецца нізкая плацежаздольнасць насельніцтва. Аформіць крэдыт на куплю нерухомасці сёння можа не кожны жыхар Віцебскай вобласці.

Было меркаванне, што кошт кватэр змяніўся з-за расійскіх пакупнікоў. Але, паводле слоў спецыялістаў, расійцы не ўплываюць на рынак беларускай нерухомасці ўжо некалькі апошніх гадоў.

– *Кошт жылля падае, але не так імкліва, як гэта было ў канцы мінулага года*, – распавёў «Народнай Волі» спецыяліст агенцтва нерухомасці ТАА «Пакадан-Віцебск» **Аляксандр Манакоў**. – *Як толькі пачынае мяняцца курс валюты, адразу ж змяняюцца цэны на нерухомасць. Прасцей кажучы, розніца паміж пакупніком і прадаўцом складае каля 15–20 працэнтаў. Кватэра выстаўляецца на продаж коштам у 35 тысяч долараў, а за яе гатовы даць толькі 30 тысяч у эквіваленце.*

Як паводзіць сябе рынак нерухомасці, спецыяліст прагназаваць не бярэцца. Сёння трохпакаёвую кватэру ў Віцебску можна набыць за 35–37 тысяч долараў, хоць раней такое жыллё каштавала ад 40 да 50 тысяч. На думку Аляксандра Манакова, такое становішча прывядзе да таго, што насельніцтва аддасць перавагу заключэнню здзелак абмену нерухомасці, чым куплі-продажу.

Раман ВАСЮКОВІЧ.

ПРОЕКТЫ

«Мне что, выйти на площадь и лечь под ноги Лукашенко?»

В районе гипермаркета «Корона», что на столичной улице Кальварийской, появится автобусная станция, снесут частный сектор, фабрика «Луч» будет вынесена за пределы Минска, а на проспекте Машерова может появиться серпантин.

На общественное обсуждение был вынесен проект по планированию территории в центре Минска. Речь о районе, ограниченном проспектами Победителей и Машерова, улицей Домашевской, железной дорогой, улицами Кальварийской и Мельникайте.

